**Саломка А.І.,** *дацэнт*

# З ГІСТОРЫІ ВЫДАННЯ ВАЕННЫХ МЕМУАРАЎ У БЕЛАРУСІ

Прайшло 50 гадоў пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Яна і сёння ў памяці тых, хто перанёс гэтую страшэнную навалу. У час агульных уніжальных адносін да нашай гісторыі пасля 1917 г. важна, каб моладзь мела магчымасць пачуць аб падзеях таго часу з вуснаў відавочцаў і сама, на падставе гэтых сведчанняў і іншых гістарычных крыніц, выпрацавала адпаведныя высновы, навучылася з пашанай адносіцца да сваёй гісторыі, да старэйшага пакалення - сваіх дзядоў і бацькоў.

У канцы 40-х гадоў была ўсвядомлена неабходнасць падрыхтоўкі і выпуску ваенных мемуараў. Успаміны пра Вялікую Айчынную вайну (пачынаючы з 1948 г. - эпізадычна і ў невялікай колькасці, а з 1955 г. - рэгулярна) друкуюцца асобнымі выданнямі і на старон-ках перыядычнага друку. Пад уплывам сацыяльна-гістарычных і палітычных фактараў з 1958 г. іх колькасць значна павышаецца. З 1969 г. ствараюцца ўмовы павышэння іх навуковага ўзроўню. Расшыраецца выдавецкая база. У 1967 г. пры рэдакцыі сацыяльна-эканамічнай і масава-палітычнай літаратуры выдавецтва «Беларусь» быў створаны сектар гістарычнай і мемуарнай літаратуры, а ў 1969 г. на яго базе арганізавана рэдакцыя мемуарнай і ваенна-патрыятычнай літаратуры. Выпуск успамінаў быў ускладзены таксама на выдавецтвы «Вышэйшая школа», «Навука і тэхніка», «Народная асвета», «Ураджай» у адпаведнасці з профілем кожнага. З 1971 г. успаміны выходзяць у свет асобнымі выданнямі ў серыі «Мемуары». За пяць гадоў у ёй было выдадзена 25 твораў. Сярэдні тыраж іх склаў 67 тыс. экземпляраў. Тады ж з'явілася магчымасць прыступіць да распрацоўкі навукова абгрунтава-

нага, рэальнага перспектыўнага плана выпуску мемуарнай літаратуры.

У 2-й палове 80-х гадоў у сувязі з паступовымі зменамі ў палітычным і эканамічным жыцці рэспублікі пачынае згортвацца работа грамадскіх, а пасля і навуковых структур па збору і сістэматызацыі ўспамінаў і іншых дакументаў. Рэдакцыя мемуарнай і ваенна-патрыятычнай літаратуры выдавецтва «Беларусь» была пераўтворана ў рэдакцыю ваенна-гістарычнай літаратуры, а потым улілася ў склад рэдакцыі грамадска-палітычнай літаратуры.

Выдадзеныя ў рэспубліцы да 1991 г. ваенныя мемуары налічваюць 292 назвы, 221 з іх - партызанскія, астатнія 71 - франтавыя мемуары. Параўнальна невялікая колькасць апошніх тлумачыцца складанасцю іх напісання, абмежаваным доступам да ваенных архіваў, вялікай змянялынасцю асабовага складу армейскіх фарміраванняў у час вайны, а таксама пэўнымі цяжкасцямі ў арганізацыі рэцэнзавання франтавых мемуараў і ў справе пошуку магчымых аўтараў.

67 выданняў мемуараў расказваюць аб барацьбе з ворагам розных партызанскіх фарміраванняў (ад злучэнняў да асобных груп), 16 - аб партызанах і падпольшчыках, 28 - аб падпольшчыках, 29 - аб камсамольцах, моладзі і дзецях, 16 - раскрываюць усенародны і 14 - інтэрнацыянальны характар барацьбы з ворагам, 11 - аб партызанскім друку і яго супрацоўніках. Ёсць успаміны аб партызанах-кавалерыстах, партызанах-артыстах, жанчынах-партызанках.

Аўтарамі большасці ўспамінаў з'яўляюцца кіраўнікі партызанскага руху і падпольнай барацьбы, 28 твораў напісаны радавымі ўдзельнікамі. Побач з выданнямі асобных аўтараў друкаваліся зборнікі.

Барацьбе з ворагам на тэрыторыі Мінскай вобласці прысвечаны 67 мемуарных выданняў, Віцебскай - 44, Магілёўскай - 31, Гомельскай і Брэсцкай - па 20. Крыху менш твораў прысвечана іншым абласцям Беларусі. Геаграфічныя межы падзей вызначаюцца перадыслакацыяй партызанскіх фарміраванняў і асабістым лёсам мемуарыста. Франтавыя мемуары

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

пісаліся рознымі па маштабу дзейнасці людзьмі, ад буйных военачальнікаў да радавых байцоў, якія ваявалі ў розных родах войскаў. Большасць з іх прысвечана авіятарам, стралковым войскам, пагранічнікам, сапёрам, армейскім разведчыкам, медыцынскім супрацоўнікам, журналістам, фотакарэспандэнтам і г.д.

Выданне мемуараў у Беларусі ў пасляваенныя гады мела стабільны характар. Разнастайным быў іх тэматычны склад. Неабходна і зараз развіваць гэты жанр, бо мемуары з'яўляюцца не толькі важнымі гіста-рычнымі крыніцамі, але і важным сродкам выхавання моладзі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ